Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б
і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 249 (318)

СУБОТА 26 КАСТРЫЧНІКА 1940 г.

Цана 10 капеек.

ВЯЛІКІ ПОСПЕХ ПАСТАНОВАК БУРАТ-МАНГОЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЫЧНА-ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА

На спектаклі «Баір» прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, А. А. Жданаў

Масквічы выключна сардэчна сустракаюць спектаклі Бурат-Мангольскага дзяржаўнага музыкальна-драматычнага тэатра. Учора гэты малады творчы калектыў у другі раз паказаў музыкальную драму «Баір», тэкст якой напісан Г. Ц. Цыдэнжапавым і А. І. Шадаевым, а музыка—Б. Б. Ямпілавым і П. М. Берлінскім.

Маладыя артысты, многія з якіх з'яўляюцца выхаванцамі музыкальна-драматычнага вучылішча ва Улан-Удэ, як і напярэдадні, упэўнена правялі спектакль. Гледачы зноў цёпла прынялі таленавітую выканаўцу ролі Булган Н. К. Пятрову. Вобраз мужнага народнага героя Баіра ўдала створан Ш. В. Каратковым. У ліку выканаўцаў іншых асноўных ролей у спектаклі выступалі Ц. Л. Хабаркоў (Хутарман), Б. Ц. Рынчына (Хоабхэ), Ц. Г. Шагжын (Сута-мэргэн), заслужаны артыст Бурат-Мангольскай АССР Н. В. Тараў (Буханай), Б. М. Балдакоў (Хан).

Фінал спектакля суправаджаўся працяглай авацыяй. Гледачы цёпла віталі таленавітых прадстаўнікоў бурат-мангольскага мастацтва.

На спектаклі прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, А. А. Жданаў.

(ТАСС).

РАЗВІВАЦЬ ГРАМАДСКУЮ АКТЫЎНАСЦЬ ПРАЦОЎНЫХ ЖАНЧЫН

Працоўныя жанчыны ў былой панскай Польшчы, як і ў царскай Расіі, знаходзіліся пад цяжкім прыгнётам памешчыкаў і капіталістаў. Праца жанчын, як правіла, ацэньвалася значна ніжэй працы мужчын. Работніцы тэкстыльнай прамысловасці Беластока атрымлівалі зарплату за адну і тую-ж работу на 30 — 40 процантаў меншую, чым мужчыны.

У такім-жа становішчы знаходзяцца зараз работніцы ўсіх капіталістычных краін. Асабліва невыносным стала жыццё працоўных жанчын ва Францыі і Англіі. Вайна прыводзіць іх да голаду, да нябачаных мучэнняў і пакут.

У капіталістычных краінах працоўныя жанчыны не могуць прымаць удзелу ў грамадска-палітычным жыцці нароўні з мужчынамі.

Зусім іншае мы маем у нашай краіне. Працоўныя жанчыны Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік поўнасцю разняволены і роўнапраўныя. Яны ва ўсім карыстаюцца аднолькавымі правамі з мужчынамі. Вось што гаворыць аб гэтым 122 артыкул Сталінскай Канстытуцыі:

«Жанчыне ў СССР прадастаўляюцца роўныя правы з мужчынамі ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця».

Вялікія, пачотныя правы! Нідзе ў капіталістычным свеце няма і не можа быць такіх правоў. Толькі ў краіне соцыялізма можа існаваць і дзейнічаць такі закон, такая рэчаіснасць.

Сапраўдная большэвіцкая рэчаіснасць. Усё, што запісана ў Канстытуцыі — ажыццёўлена. Жанчыны ў Совецкім Саюзе маюць аднолькавыя з мужчынамі правы на працу, на аплату працы, на адпачынак, асвету і т. д. Яны з чэсцю выконваюць свае грамадзянскія абавязкі. Толькі ў буйнай прамысловасці звыш 100 тысяч жанчын працуюць інжынерамі і тэхнікамі, звыш 12 тысяч жанчын — навуковымі работнікамі. Каля 55 тысяч жанчын працуюць урачамі.

У дзяржаўным і грамадскім жыцці совецкія жанчыны прымаюць самы актыўны ўдзел. Звыш 1600 жанчын выбраны дэпутатамі Вярхоўных Советаў СССР, саюзных і аўтаномных рэспублік. У мясцовыя Советы па Саюзу выбрана 422.279 жанчын. У профсаюзным, комсамольскім — ва ўсім грамадска-палітычным жыцці прымаюць удзел каля 30 мільёнаў жанчын.

Грамадская актыўнасць жанчын у СССР расце з кожным годам, з кожным месяцам. Гэты рост усяляк падтрымліваецца і ўзначальваецца нашай вялікай комуністычнай партыяй. Яшчэ на XVII з'ездзе ВКП(б) таварыш Сталін указваў, што «... мы павінны вітаць растучую грамадскую актыўнасць працоўных жанчын і іх вылучэнне на кіруючыя пасты, як несумненны прызнак росту нашай культурнасці».

Совецкая культура атрымала шырокі размах і на тэрыторыі заходніх абласцей БССР. Вызваленыя доблеснай Чырвонай Арміяй працоўныя жанчыны з радасцю ўліліся ў рады шчаслівых совецкіх грамадзян, з радасцю сталі пад яркае сонца Сталінскай Канстытуцыі. Яны карыстаюцца ўсімі грамадзянскімі правамі, усімі дабротамі совецкіх законаў. Аб гэтым пераканаўча гаворыць прайшоўшы год новага совецкага жыцця.

Тысячы жанчын нашай вобласці атрымалі работу. Сотні работніц і сялянак занялі адказныя пасты на прадпрыемствах, у калгасах, установах, у грамадскіх арганізацыях.

Сялянка Р. А. Габец у Гродненскім раёне вылучана на пасаду старшыні Лашанскага сельсовета. Сялянкі М. М. Жвава, Г. А. Камароўская і іншыя (Кольнаўскі раён) працуюць загадчыкамі хат-чытальнь.

Многія жанчыны — былыя беспрацоўныя, хатнія гаспадыні, работніцы-сялянкі вылучаны на пасады сакратароў і намеснікаў старшынь сельсоветаў, на пасады начальнікаў цэхаў, старшынь фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў і на іншыя адказныя пасты. Былая палітзняволеная прадзільшчыца Жэня Каплан цяпер з'яўляецца дырэктарам Беластоцкай тэкстыльнай фабрыкі № 25. Тт. Цобіна, Дзіновіч і многія іншыя жанчыны выбраны старшынямі фабрычных камітэтаў. У ліку дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР мы бачым усім вядомую Марыю Дз'ячук, у ліку дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР— Еўдакію Максімюк, Юзэфу Каханскую і іншых.

Вялікую сілу прадстаўляюць жанчыны па нашай вобласці літаральна ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і культуры. Профоргамі цэхаў на прадпрыемствах Беластока працуе звыш 150 жанчын, 59 жанчын па вобласці—загадчыкі пачатковых школ. На кіруючую гаспадарчую і совецкую работу вылучаны ў Бельскім раёне 32 жанчыны, у горадзе Гродна — 66 жанчын, у Гродненскім раёне — 33 і т. д.

На ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва жанчыны з чэсцю спраўляюцца з ускладзенымі на іх абавязкамі. Добра працуюць былая краўчыха (цяпер загадчыца райзагса ў Крынках) тав. Х. І. Кізнер, былая сялянка (цяпер агент Крынкаўскага райупаўнаркамзага), Н. Л. Рабіновіч, былая хатняя гаспадыня (цяпер сакратар сельсовета ў Ломжынскім раёне), Р. Р. Глінкоўская і многія іншыя. Жаночая брыгада лесарубаў з вёскі Лазніска, Саколкаўскага раёна, у саставе Рамановіч, Горэш, Гапонік, Панасевіч і Амельчык штодзённа выконвае план на 200 процантаў і дае за змену па 70 кубаметраў лесу. На беластоцкім тэкстыльным камбінаце № 4 сярод 44 стаханаўцаў — 26 жанчын.

Вялікую работу пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый правялі жанчыны ў нашай вобласці ў дні кампаніі па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Іх у значнай колькасці можна было бачыць на кожным выбарчым участку. Жанчыны з'яўляліся членамі камісій, даверанымі асобамі, актыўнымі агітатарамі. З радасцю яны ўключыліся і ў кампанію па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Ва ўсіх гарадах і раёнах вобласці жанчыны-актывісткі прыступілі да агітацыйнай работы на выбарчых участках. Уютчыца тав. Вархавер, работніца тав. Здрадоўская і астатнія 22 агітатары-жанчыны 4-га тэкстыльнага камбіната пачалі раз'ясняць рабочым і работніцам Палажэнне аб выбарах. 15 агітатараў—работніц тэкстыльнага камбіната № 2 прыступілі да агітацыйнай работы ў Беластоку на выбарчым участку № 10.

Сотні жанчын пачынаюць вялікую работу ў выбарчых камісіях. Рабочыя і работніцы адной толькі беластоцкай плюшавай фабрыкі ў выбарчыя камісіі вылучылі 23 жанчыны.

На 18 прадпрыемствах вобласці і 52 пунктах Беластоцкай чыгункі створаны жаночыя советы. На тэкстыльных фабрыках №№ 17, 23, 25, 27 і іншых пачалася масава-палітычная работа сярод жонак рабочых і служачых—хатніх гаспадынь. Трэба, каб такая работа неадкладна павялася сярод хатніх гаспадынь на ўсіх прадпрыемствах і ва ўстановах, на ўсіх выбарчых участках. Гарадскія, раённыя і пярвічныя партыйныя арганізацыі павінны ўзмацніць работу сярод жанчын, усямерна пашыраць іх грамадскую актыўнасць, прыцягнуць да самай актыўнай работы на выбарчых участках.

ГРАЕЎСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПЛАН БУЛЬБАПАСТАВАК

ГРАЕВА. (Ад нашага карэспандэнта). Выбарчая кампанія выклікала новы ўздым сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў раёна. Усюды шырыцца перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва за хутчэйшае заканчэнне сельскагаспадарчых работ.

Пяршынства ў спаборніцтве трымаюць калгаснікі раёна. На іх палях ужо закончана ўборка бульбы і падняцце зябліва. Калгасы поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па абавязковых пастаўках сельскагаспадарчых прадуктаў. Значных поспехаў таксама дабіліся і аднаасобнікі. Яны закончылі здачу бульбы дзяржаве ў лік дзяржаўных паставак.

В. Гарбанёў.

Аб падрыхтоўцы да зімоўкі жывёлы ў калгасах і соўгасах Беластоцкай вобласці

Пастанова Беластоцкага аблвыканкома і абкома КП(б)Б

У адпаведнасці з пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да зімоўкі жывёлы ў калгасах і соўгасах, Беластоцкі абласны выканаўчы камітэт і абласны камітэт КП(б)Б **пастанаўляюць:**

1. Абавязаць аблземаддзел, райвыканкомы, райкомы КП(б)Б, загадчыкаў райземаддзелаў і дырэктараў соўгасаў да 10 лістапада г. г. праверыць і забяспечыць сканчэнне будаўніцтва новых, рамонт і ўцяпленне старых памяшканняў для жывёлы, арганізацыю і правільнасць аплаты працы на фермах. Рэзультаты праверкі абмяркаваць на сходах калгаснікаў і пасяджэннях райвыканкомаў з прыняццем канкрэтных мер па ўстараненню існуючых недахопаў у падрыхтоўцы да зімоўкі жывёлы. Забяспечыць поўнае захаванне маладняка, як асноўнай крыніцы далейшага росту пагалоўя жывёлы ў калгасах і соўгасах.

2. Даручыць старшыням райвыканкомаў, загадчыкам райземаддзелаў, дырэктарам соўгасаў і праўленням калгасаў арганізаваць брыгады па будаўніцтву, абсталяванню і прыстасаванню жывёлагадоўчых будынкаў у кожным калгасе і соўгасе, разам з калгаснікамі ўстанавіць тэрмін сканчэння гэтай работы і аказаць неабходную дапамогу спецыялістамі, забяспечыўшы ўтрыманне жывёлы ў зімовы час у цёплых, абсталяваных памяшканнях.

3. Абавязаць аблземаддзел, загадчыкаў райземаддзелаў і дырэктараў соўгасаў правесці ў кожным соўгасе і калгасе ветэрынарна-зоатэхнічны агляд жывёлы і дэзінфекцыю памяшканняў. У гаспадарках, дзе існуюць інфекцыйныя захворванні жывёлы, выдзеліць асобныя ізаляваныя памяшканні для хворай жывёлы, абслугоўваючы персанал для індывідуальнага догляду і кармлення да поўнага выздараўлення.

Даручыць загадчыку аблземаддзела тав. Ніпчыку камандзіраваць увесь ветэрынарна-зоатэхнічны персанал у калгасы і соўгасы на тэрмін не менш аднаго месяца для аказання дапамогі ў падрыхтоўцы да зімоўкі жывёлы, санітарна-ветэрынарнай апрацоўцы жывёлы і інструктыраванні калгасных жывёлагадоўчых кадраў.

4. Абавязаць аблземаддзел, загадчыкаў райземаддзелаў, дырэктараў соўгасаў, райвыканкомы і райкомы КП(б)Б да 10 лістапада г. г. праверыць ва ўсіх калгасах і соўгасах наяўнасць усіх відаў кармоў, закончыўшы да наступлення халадоў сціртаванне ўсёй саломы, скарыстаць поўнасцю бацвінне карняплодаў і атаву для накаплення сіласаваных кармоў. Арганізаваць неабходную ахову і эканомнае выдатковаванне, з разлікам поўнага забеспячэння кармамі грамадскай жывёлы калгасаў і соўгасў, і жывёлы індывідуальнага карыстання калгаснікаў.

5. Улічваючы, што ў справе далейшага развіцця жывёлагадоўлі і павышэння яе прадукцыйнасці вялікае значэнне мае пастаянны састаў кадраў, якія працуюць на фермах, абавязаць райкомы партыі, райвыканкомы і зямельныя органы прыняць меры да выдзялення і замацавання пастаяннага саставу калгаснікаў для работы на жывёлагадоўчых фермах, у адпаведнасці з статутам сельгасарцелі.

6. Прадаставіць раённым зоатэхнікам і раённым ветэрынарным урачам права ў выпадку безгаспадарчых і нядбайных адносін да калгаснай жывёлы накладаць на старшынь калгасаў і загадчыкаў фермамі штраф з іх асабістых сродкаў у размеры да 100 рублёў. Накладанне штрафу на асоб, вінаватых у безгаспадарчых адносінах да жывёлы, рабіць з зацвярджэння райвыканкомаў.

7. Даручыць сакратарам райкомаў партыі, старшыням райвыканкомаў і загадчыкам райземаддзелаў арганізаваць прыёмку гатоўнасці жывёлагадоўчых будынкаў да зімоўкі жывёлы ў соўгасах і калгасах камісіямі ў саставе: старшыні сельсовета, зоатэхніка, старшыні калгаса, загадчыка фермай і старшыні рэвізійнай камісіі калгаса.

8. Прапанаваць сакратарам райкомаў КП(б)Б і старшыням райвыканкомаў не пазней 10 лістапада г. г. абмеркаваць на пасяджэннях бюро райкомаў і прэзідыумаў райвыканкомаў вынікі праверкі гатоўнасці да зімоўкі жывёлы ў калгасах і соўгасах. Аб становішчы спраў і прынятых мерах паведаміць аблвыканкому і абкому КП(б)Б да 12 лістапада.

Аблвыканком і абком КП(б)Б папярэджваюць сакратароў райкомаў КП(б)Б, старшынь райвыканкомаў і загадчыкаў райземаддзелаў і дырэктараў соўгасаў аб іх асабістай адказнасці за своечасовую падрыхтоўку жывёлы да зімоўкі і захаванне прыплоду маладняка ў соўгасах і калгасах.

9. Абавязаць рэдактараў абласной і раённых газет сістэматычна асвятляць ход падрыхтоўкі зімоўкі для жывёлы ў калгасах і соўгасах.

Старшыня беластоцкага аблвыканкома С. МАЛЬЦАЎ

Сакратар беластоцкага абкома КП(б)Б Н. КІСЯЛЁЎ.

Разгорнем шырокую палітычную работу на выбарчых участках

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ У КРЫНКАЎСКІМ РАЁНЕ

У Крынкаўскім раёне шырока разгортваецца падрыхтоўчая работа па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Праведзены расшыраныя пленумы сельсоветаў, сходы калгаснікаў, на якіх абмеркаван Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

На сходзе калгаснікаў сельгасарцелі імені Сталіна, Глебавіцкага сельсовета, выступіў калгаснік тав. Аршчук, які сказаў:

— Мы памятаем, як нам прыходзілася выбіраць у панскай Польшчы. Жандары стаялі над намі і насільна прымушалі галасаваць за ненавісных нам людзей — капіталістаў і памешчыкаў, а хто не хацеў галасаваць, таго саджалі ў турмы, збівалі. Мы прыносім глыбокую ўдзячнасць нашай доблеснай Чырвонай Арміі за тое, што яна нас назаўсёды вызваліла ад польскіх паноў.

Селянін вёскі Лапенеўцы, Глебавіцкага сельсовета, у сваім выступленні заявіў:

— Нас прадавалі памешчыкі і капіталісты. Мы не мелі сапраўднай свабоды. Толькі совецкая ўлада дала нам магчымасць свабодна выбіраць органы сваёй улады. У польскай дзяржаве прыходзілася галасаваць толькі за кулакоў таму, што была іх улада, а цяпер мы свабодна будзем выбіраць на аснове вялікай Сталінскай Канстытуцыі.

У сельсоветах прыступілі да стварэння гурткоў па вывучэнню Палажэння аб выбарах і Сталінскай Канстытуцыі. У Глебавіцкім сельсовеце арганізавана 5 такіх гурткоў, кіраўнікамі якіх вылучаны настаўнікі тт. Мысаў, Пятроўская, Сенчыла, Хмельніцкі, Валуева.

Закончана арганізацыя выбарчых акруг. На агульных сходах працоўных вылучаны ў састаў акруговых выбарчых камісій 1.323 чалавекі.

Лепшыя людзі раёна вылучаны ў акруговыя камісіі. Рабочыя скурзавода № 6 вылучылі ў састаў акруговай камісіі па выбарах у абласны Совет майстра зольнадубільнага аддзела юфтавага цэха тав. Натовіча Самуіла Давыдавіча.

Калгаснікі калгаса імені Кастрычніцкай рэволюцыі аднагалосна вылучылі ў састаў выбарчай камісіі старшыню сельгасарцелі тав. Марцуля Івана Кліменц'евіча.

С. Эцін,

загадчык оргінструктарскім аддзелам Крынкаўскага райкома партыі.

ЧАКАЮЦЬ „РАСПАРАДЖЭННЯЎ“

Велізарнае значэнне мае палітычная агітацыя ў забеспячэнні паспяховага правядзення выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

У Ваўкавыску, як відаць, не разумеюць гэтага. Райком партыі да апошняга часу ўсю падрыхтоўку да выбараў зводзіць толькі да вырашэння арганізацыйных пытанняў, звязаных з выбарчымі камісіямі.

На трох нарадах партыйнага і совецкага актыва, якія адбыліся пры райкоме партыі, ні аднаго разу не ставілася пытанне аб разгортванні агітацыйнай работы. Прадстаўнікі райкома ў сельсоветах сваю работу зводзяць да збірання звестак.

У Дыхнавецкім сельсовеце не створан ні адзін гурток па вывучэнню Канстытуцыі і выбарчага закона. Прадстаўнік райкома партыі тав. Шчэрбакоў нават і не думае арганізоўваць агітработу. Старшыня гэтага сельсовета тав. Лакатун заяўляе: «Навошта брацца за разгортванне агітацыйна-масавай работы. На гэта не было яшчэ распараджэння».

Такога «распараджэння» чакаюць амаль ва ўсіх сельсоветах раёна.

Па спісках аддзела прапаганды і агітацыі ў райкоме налічваецца 21 агіткалектыў, у якіх 369 агітатараў. Але гэтыя агіткалектывы пасля выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР не працуюць. Іх работай на працягу ўсяго перыяда аддзел прапаганды райкома партыі не цікавіўся. Многія кіраўнікі агіткалектываў нават выбылі з раёна. Падборам новых людзей для агітацыйнай работы сярод насельніцтва ніхто не займаўся. У райкоме нават няма плана масавай работы ў сувязі з падрыхтоўкай да выбараў.

Адсутнасць агітацыйнай работы дае магчымасць варожым элементам весці сваю работу. Бываюць выпадкі, што ў выбарчыя камісіі імкнуцца пралезці былыя солтысы, кулакі.

Пакуль не позна, райкому партыі трэба прыняць меры па наладжванню агітацыйна-масавай работы.

Д. Казлоў.

Актывісткі аднаго камбіната

Тав. Куклінская на 4-м беластоцкім тэкстыльным камбінаце першай сярод жанчын стала стаханаўкай. Працуючы загоншчыцай, яна сістэматычна перавыконвае свае нормы.

На гэтым-жа камбінаце цяпер працуе і яе муж Осіп у якасці загадчыка гаспадарчай часткі, сын Уладзімір—загадчык магазіна па фанерным заводзе. Ён першым з мясцовай моладзі ў Беластоку ўступіў у рады комсамола. Дачка Еўгенія—піонерка; вучыцца у 5-м класе 13-й школы.

Непазнавальным стала жыццё сям'і Тэадоры Власаўны Куклінскай: зарабляюць яны ў месяц больш 850 рублёў.

У грамадскай рабоце прымаюць актыўны ўдзел усе члены сям'і. Дачка—актывістка піонерскага атрада, сын—актывіст комсамольскай арганізацыі, муж—у профсаюзе. Сама Тэадора Власаўна актыўны агітатар на камбінаце. Сярод рабочых і работніц апаратнага цэха і вартавой аховы яна растлумачвае зараз Палажэнне аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Куклінская на 4-м камбінаце не адна. Сем жанчын працуюць профоргамі ў цэхах, сем жанчын—страхавымі дэлегатамі, 22—агітатарамі.

Агітатары тт. Ольга Пятроўна Здрадоўская, Тэафіла Маркаўна Вархавер і іншыя, як і тав. Куклінская, прыступілі да работы на выбарчых участках.

Профорг прадзільнага цэха тав. С. Пудоўская нядрэнна арганізавала соцыялістычнае спаборніцтва рабочых і работніц за павышэнне прадукцыйнасці працы, за поўную ліквідацыю прастояў. Добра спраўляючыся з работай, яна адначасова многа працуе над сабой, вывучае «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», наведвае курсы профоргаў пры абкоме шарсцянікаў.

Стаханаўка-матальшчыца тав. Л. Ольчык актыўна працуе ў совеце соцыяльнага страхавання, а на вытворчасці свае нормы штодзённа выконвае на 125 процантаў.

На камбінаце 44 стаханаўцы. Сярод іх—26 жанчын. Лепшымі стаханаўкамі з'яўляюцца тт. Здрадоўская, Куклінская і іншыя.

Усю работу сярод жанчын арганізоўвае былая палітзняволеная, матальшчыца, а зараз старшыня фабкома тав. Сара Ізраілеўна Цобіна. Кіруючыся ўказаннямі гаркома КП(б)Б, з дапамогай комуністаў і комсамольцаў камбіната яна ўцягнула многіх жанчын у актыўную работу ва ўсіх грамадскіх арганізацыях камбіната.

— Жанчыны на нашым камбінаце,—гаворыць тав. Цобіна, — сапраўды з'яўляюцца вялікай сілай. Іх у нас звыш 200 чалавек — 50 процантаў агульнай колькасці рабочых. У грамадскай рабоце актыўны ўдзел прымаюць каля 70 работніц. Усе яны да прыходу Чырвонай Арміі аб такім радасным жыцці нават і не марылі. Многія з іх раней зусім не працавалі, многія працавалі толькі па некалькі тыдняў у год.

Совет па рабоце сярод жон рабочых і служачых на камбінаце яшчэ не арганізаван. Але-ж работа з імі пачалася. Актывісткі камбіната ўцягваюць зараз у грамадскую работу камбіната хатніх гаспадынь, у першую чаргу ў работу па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

В. Дзям'янаў.

НАРАДА РЭДАКТАРАЎ РАЁННЫХ ГАЗЕТ

Учора, 25 кастрычніка, у абкоме КП(б)Б адбылася нарада рэдактараў раённых газет Беластоцкай вобласці. З паведамленнямі аб удзеле раённых газет і нізавога друку ў падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных выступілі рэдактары раённых газет тт. Калека (Ваўкавыск), Крэстнікаў (Ломжа), Шулейка (Аўгустоў), Раманенка (Саколкі), Філімонаў (Гродна), Каўпак (Лапы), Казуноў (Бельск).

Нарада абмеркавала мерапрыемствы раённых газет па падрыхтоўцы і правядзенню выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

На нарадзе выступіў сакратар абкома КП(б)Б тав. Сямёнаў, які падрабязна спыніўся на задачах газет у прадстаячых выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

ПРЫЁМ ЯПОНСКАГА ПАСЛА п. ТАТЭКАВА ТАВ. В. М. МОЛАТАВЫМ

25 кастрычніка старшыня Соўнаркома і Народны Камісар замежных спраў Саюза ССР тав. В. М. Молатаў прыняў новага японскага пасла пана Татэкава.

АРЫШТ ЭРЫО

БЕРЛІН, 25 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, былы старшыня французскай палаты дэпутатаў Эрыо больш не знаходзіцца ў Ліоне. Французскія ўлады трымаюць у сакрэце месца яго зняволення.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

ЛОНДАН, 25 кастрычніка. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі перадае, што ўчора ўдзень англійскія самалёты скінулі бомбы на Остэндэ Гравелін, заводы і таварныя склады каля Кале і на транспарт суднаў паблізу Зеебруге. Адзін самалёт не вярнуўся на сваю базу.

У ноч на 25 кастрычніка бамбардыроўцы падвергліся ваенныя аб'екты ў раёне Берліна, нафтаперагонныя заводы у Гамбургу, Гановеры, Гельзенкірхене, докі і судны ў Гамбургу, Куксхафене, Брэменхафене, Вільгальмсхафене, Ротэрдаме, Гаўры і Лорыане, чыгуначныя камунікацыі і таварныя склады ў Эмерыху, Мюнстэры, Гаме, Ботрану, Дзюісбургу, электрастанцыя ў Гамбургу, порты Флісінген, Остэндэ, Дзюнкерк, а таксама некалькі непрыяцельскіх аэрадромаў.

ХРОНІКА

Соўнарком СССР пастанавіў перанесці ў гэтым годзе дзень адпачынку з нядзелі 10 лістапада на суботу 9 лістапада. (ТАСС).

ПАСТАНОВА БЕЛАСТОЦКАГА ГАРАДСКОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

Аб утварэнні ў горадзе Беластоку выбарчых участкаў па выбарах у абласны і гарадскі Советы дэпутатаў працоўных

На падставе Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 12-га кастрычніка 1940 года і арт. арт. 57, 58 і 61 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР», Беластоцкі гарадскі выканаўчы камітэт **пастанаўляе:**

Утварыць выбарчыя ўчасткі па выбарах дэпутатаў у абласны і гарадскі Советы.

У Ленінскай выбарчай акрузе № 1 па выбарах дэпутатаў у абласны Совет

Ламаносаўскі выбарчы ўчастак № 1 з цэнтрам — Супраслеўскае шасе (дом № 4) з вуліцамі: шасе да Васількова, шасе да Супраслі, Ладожская, Сувязная, Уральская, Рабочая, Крайняя, Усходняя, Тарноўская, Чырвонагвардзейская, Ламаносава, Садовая, Вяземская, Кальцавая, Асенняя.

Орджанікідзеўскі выбарчы ўчастак № 2 з цэнтрам Танкавая вул. (дом 5, кватэра № 1) з вуліцамі: Орджанікідзе, Свабодная, Секцыйная, Камбайнерская, Вінніцкая, Танкавая, Маладая, шасе да Зялёпай, Макавая, Багнаўская, Свежая, Заціішша, Пустая, Пячуркі, Земляробчая, Дняпроўская, Сялянская.

Фабрычны выбарчы ўчастак № 3 з цэнтрам—Ленінская вул. (дом 103, домаўпраўленне) з вуліцамі: Вузкая, Фабрычная, Ленінская да пераезда, Вугальная.

Беларускі выбарчы ўчастак № 4 з цэнтрам—Беларуская вул. (дом № 9, кантора Леспрамгаса) з вуліцамі: Таварная, Лугавая, Рыжская, Залатая, Карла Маркса, Беларуская, Дружная, Полацкая, Орэнбургская.

Ленінскі выбарчы ўчастак № 5 з цэнтрам—Ленінская вул. (дом № 4, школа) з вуліцамі: Ленінская з дома № 61 па дом № 140.

Кіраўскі выбарчы ўчастак № 6 з цэнтрам — рог вуліц Кірава і Агароднай (школа № 7) з вуліцамі: Агародная, Пяцігорская, Арліная, Каменная, Сіняя, Пясочная, Херсонская, Данская, Кірава ад Данскай да Пяцігорскай, Чкалава ад Совецкай да Пяцігорскай.

Дзержынскі выбарчы ўчастак № 7 з цэнтрам—вул. Кірава (дом № 38, школа № 5) з вуліцамі: Кірава ад Данской да чыгункі, Добрая, Орлоўская, Дзержынскага, Саломенная, Далёкая, Пагранічная, Благоева, Фізкультурная.

У Чырвонаармейскай выбарчай акрузе № 2 па выбарах дэпутатаў у абласны Совет

Дайлідскі выбарчы ўчастак № 1 з цэнтрам — клуб фанернага завода, з вуліцамі: Дайліды-піўзавод, соўгас і МТМ, Волжская, Прудная, Заблудаўскае шасе, Падгорная, Паўднёвае шасе, Зернавая, Глінкі, Лясная, пасёлак Засцянская.

Аўгустоўскі выбарчы ўчастак № 2 з цэнтрам—вул. Сяргея Лазо (школа № 17) з вуліцамі: Соцыялістычная, Крывая, Аўгустоўская, Дрэўняная, Калодзежная, Усадзебная, Сако і Ванцэці, Беднарская, 8-е сакавіка, Сяргея Лазо, Усходняе шасе, Паўднёвае шасе.

Чырвонаармейскі выбарчы ўчастак № 3 з цэнтрам — Чырвонаармейская вул. (дом № 140, кантора суконнай фабрыкі) з вуліцамі: Пячурская, Сызранская, 9-е студзеня, Чырвонаармейская ад Крупскай да вул. Красіна.

Куйбышаўскі выбарчы ўчастак № 4 з цэнтрам—вул. Куйбышава (дом № 36) з вуліцамі: Куйбышава, Шопена, Вольная, Крупскай, Меблевая.

Фурманаўскі выбарчы ўчастак № 5 з цэнтрам — Мадлінская вул. (дом № 8, будынак Народнага суда) з вуліцамі: Стары Рынак, Мадлінская, Папярэчная, Летняя, Фурманава, Сташыца, Гліняная, Горкага ад Кірава да Крупскай.

Горкаўскі выбарчы ўчастак № 6 з цэнтрам—вул. Кірава (дом № 38, школа №5) з вуліцамі: Горкага ад чыгункі да Грыбавай, Грыбавая, Акопная, Горкага паміж Грыбавай і Акопнай, Горкага ад Акопнай да Крупскай.

У Фабрычнай выбарчай акрузе № 3 па выбарах дэпутатаў у абласны Совет

Пролетарскі выбарчы ўчастак № 1 з цэнтрам — Пролетарская вул. (дом № 36, кантора аблветсклада) з вуліцамі: Пролетарская да Юравецкай — правы бок.

Пролетарскі выбарчы ўчастак № 2 з цэнтрам — Пролетарская вул. (дом № 49, школа № 10) з вуліцамі: Пролетарская ад Совецкай да Юравецкай — левы бок.

Юравецкі выбарчы ўчастак № 3 з цэнтрам — Юравецкая вул. (памяшканне палаты «Мер і ваг») з вуліцамі: Юравецкая ад Ленінскай да Палескай.

Інтэрнацыянальны выбарчы ўчастак № 4 з цэнтрам — Совецкая вул. (дом №43, памяшканне абсельгасбанка і промбанка) з вуліцамі: Ленінградская, Інтэрнацыянальная, Хазановіча.

Бранскі выбарчы ўчастак № 5 з цэнтрам — Пролетарская вул. (дом № 26, рог Белай, кантора аблгандлю) з вуліцамі: Ленінская да Чырвонаармейскай, Белая, Бранская, Заменгофа ад Совецкай да Надрэчнай.

Свердлоўскі выбарчы ўчастак № 6 з цэнтрам — вул. Герцэна (дом № 2, клуб тэкстыльшчыкаў) з вуліцамі: Пятроўская, Герцэна, Свердлова ад Ленінградскай да Беластачанскай.

Ленінска-фабрычны выбарчы ўчастак № 7 з цэнтрам — Фабрычная вул. (дом № 10, школа № 12) з вуліцамі: Ленінская ад Чырвонаармейскай да Пяцігорскай, Агародная ад Фабрычнай да Ленінскай, Фабрычная ад Юравецкай да Палескай.

Халтурынскі выбарчы ўчастак № 8 з цэнтрам — Палеская вул. (дом № 12, клуб кафельнага завода) з вуліцамі: Фабрычная ад Палескай да чыгункі, Вішнёвая, Халтурына, Вузкая ад Агароднай да чыгункі, Цёплая, Хмельная.

Палескі выбарчы ўчастак № 9 з цэнтрам—Навагрудская вул. (дом № 1, кантора гідраметслужбы) з вуліцамі: Асавецкая, Плоцкая, Мазурская, Тапольская, Смольная, Гомельская, Навагрудская, Горная, Палеская.

Беластачанскі выбарчы ўчастак № 10 з цэнтрам —Беластачанская вул. (дом № 7, кантора ткацкай фабрыкі) з вуліцамі: Жытняя, Грасўская, Беластачанская ад Палескай да Пролетарскай, Круглая, Разіна.

У Совецкай выбарчай акрузе № 4 па выбарах дэпутатаў у абласны Совет

Совецкі выбарчы ўчастак № 1 з цэнтрам —Совецкая вул. (дом № 40, Дом народнай творчасці) з вуліцамі: Совецкая плошча (былы Рынак Касцюшкі).

Авіяцыйны выбарчы ўчастак № 2 з цэнтрам — вул. Талстога (дом № 6, школа № 30) з вуліцамі: Надрэчная, Няцэлая, Талстога, Совецкая — правы бок ад вугла Авіяцыйнай да аблвыканкома, Совецкая — левы бок ад вугла Талстога да Чкалава, Замкавая, Авіяцыйная да Маскоўскай, Беламорская, Фасгаўская, Цагельная.

Маскоўскі выбарчы ўчастак № 3 з цэнтрам—Рыбны Рынак (памяшканне канторы і клуба піўнога завода) з вуліцамі: Маскоўская, Энгельса, Алейная, Складская, Рыбны Рынак ад вугла Тіміразева да Маскоўскай, Чацкага, Хворасціна.

Тіміразеўскі выбарчы ўчастак № 4 з цэнтрам — Авіяцыйная вул. (дом № 21, кантора скурзавода) з вуліцамі: Тіміразева, Беразовая, Мядовая, Дубовая, Супраслеўская да Мядовай, Скідэльская.

Комінтэрнаўскі выбарчы ўчастак № 5 з цэнтрам — Комінтэрнаўская вул. (клуб плюшавай фабрыкі) з вуліцамі: Падлесная, Прамысловая, Чэхава, Шэўчэнка, Паркавая, Комінтэрнаўская ад плюшавай фабрыкі да Чырвонаармейскай, Комінтэрнаўская ад парка да плюшавай фабрыкі, Халодная.

Чырвонаармейскі выбарчы ўчастак № 6 з цэнтрам — Чырвонаармейская вул. (дом № 30, кантора аблбудтрэста) з вуліцамі: Чырвонаармейская ад Ленінскай да Крупскай — левы бок.

Вузаўскі выбарчы ўчастак № 7 з цэнтрам — Чырвонаармейская вул. (дом № 63, педінстытут) з вуліцамі: Чырвонаармейская ад Ленінскай да Крупскай — правы бок.

Выбарчы ўчастак № 8 імені Міцкевіча з цэнтрам—вул. Міцкевіча (дом № 15, клуб камбіната № 6) з вуліцамі: Шчорса, Катоўскага, Міцкевіча да Паркавай, Міцкевіча ад Паркавай да Соцыялістычнай, Ожэшка.

Чырвонаармейскі выбарчы ўчастак № 9 з цэнтрам—1-ая гарадская бальніца.

Чырвонаармейскі выбарчы ўчастак № 10 з цэнтрам — 3-я гарадская бальніца.

Комінтэрнаўскі выбарчы ўчастак № 11 (бальнічны) — 2-і гарадскі радзільны дом.

Тіміразеўскі выбарчы ўчастак № 12 (бальнічны) —2-я гарадская бальніца.

У Цэнтральнай выбарчай акрузе № 5 па выбарах дэпутатаў у абласны Совет

Суражскі выбарчы ўчастак № 1 з цэнтрам — Суражская вул. (дом № 6, кантора плодагародніны) з вуліцамі: Гусіная, Заліўная, Ардынацкая, Воўчая, Школьная, Глухая, Суражская.

Седоўскі выбарчы ўчастак № 2 з цэнтрам — Авіяцыйная (дом № 12, рэнтгенаўскі інстытут) з вуліцамі: Сухая, Трактарная, Авіяцыйная ад Маскоўскай да Седова, Авіяцыйная ад Седова да Трактарнай, Седова, Сталярная.

Ковенскі выбарчы ўчастак № 3 з цэнтрам — вул. Сасновая (дом № 2, лесазагатоўчая кантора) з вуліцамі: Калушынская, Віленская, Ахотніцкая, Сасновая ад Воўчай да Індурскай, Індурская, Сасновая ад Індурскай да Сеннай, Гродненская, Мінская, Ковенская, Заблудаўская, Гонецдская.

Чэрнышэўскі выбарчы ўчастак № 4 з цэнтрам—вул. Чэрнышэўскага (школа № 26) з вуліцамі: Гарохавая, Сенная, Бердычаўская, Заслаўская, Чэрнышэўскага, Розы Люксембург, Ваўкавыская.

Кастрычніцкі выбарчы ўчастак № 5 з цэнтрам — Кастрычніцкая вул. (дом № 5, кантора 29-й фабрыкі) з вуліцамі: Мічурына, Арлянская, Чырвоназвёздная, Ціхая, Кракаўская, Кастрычніцкая ад Совецкай да Суконнай.

Совецкі Цэнтральны выбарчы участак № 6 з цэнтрам — Совецкая вул. (дом № 127, памяшканне школы) з вуліцамі: Совецкая ад Чапаеўскай да Ленінградскай.

Сасноўскі выбарчы ўчастак № 7 з цэнтрам — Сасновая вул. (памяшканне новай школы) з вуліцамі: Сасновая ад Мінскай да Суконнай.

Лермантаўскі выбарчы ўчастак № 8 з цэнтрам — Сасновая вул. (дом № 47, кантора 24-й тэкстыльнай фабрыкі) з вуліцамі: Пешая, Мрамарная, Лермантава, Чайкоўскага ад Кракаўскай да Суконнай.

Кіеўскі выбарчы ўчастак № 9 з цэнтрам — Кіеўская вул. (дом № 1, памяшканне школы) з вуліцамі: Одэская, Кіеўская, Жоўтая, Млаўская, Урыцкага ад Сасновай да Калужскай.

Млыновы выбарчы ўчастак № 10 з цэнтрам — Мазавецкая вул. (дом № 6, памяшканне школы) з вуліцамі: Млыновая, Цыганская, Алавяная, Чырвоная, Ясная.

У Слабодскай выбарчай акрузе № 6 па выбарах дэпутатаў у абласны Совет

Прамысловы выбарчы ўчастак № 1 з цэнтрам — вул. Тіміразева, (дом № 4, кантора аховы сувязі) з вуліцамі: Супраслеўская ад Мядовай да Сталярнай, Супраслеўская ад Сталярнай да Седова, Седова, Баруўскага, Берсона, Рыбны Рынак, Бельская.

Маякоўскі выбарчы ўчастак № 2 з цэнтрам — вул. Маякоўскага (дом № 18, школа № 29) з вуліцамі: Мясніковa ад казарм да Сеннага Рынка, Кобрынская, Маякоўскага ад Сеннага Рынка да казармаў.

Комсамольскі выбарчы ўчастак № 3 з цэнтрам — вул. Мазавецкая (дом № 33, школа № 20) з вуліцамі: Сенны Рынак, Аргентынская, Мазавецкая ад Холмскай да Трактарнай, Комсамольская ад Мадлінскай да Цешынскай, Цешынская.

Чэлюскінскі выбарчы ўчастак № 4 з цэнтрам — вул. Жалезная (дом № 19, памяшканне ленінскага кутка скурзавода) з вуліцамі: Чэлюскіна, Альховая, Шпітальная, Скураная.

Мазавецкі выбарчы ўчастак № 5 з цэнтрам—Мазавецкая вуліца (дом № 33, школа) з вуліцамі: Вясёлая, Браварная, Холмская, Любельская, Пераходная, Жытомірская, Астравецкая, Шклоўская, Мазавецкая ад Холмскай да Паўднёвага шасе, Малая.

Плеханаўскі выбарчы ўчастак № 6 з цэнтрам — вуліца Комсамольская (дом № 2, памяшканне млыновага трэста) з вуліцамі: Комсамольская ад Любельскай да Паўднёвага шасе, Магілеўская, Віцебская, Каляеўская, Асавецкая, Дастаеўскага, Харкаўская, Плеханава ад Млыновай да Паўднёвага шасе, Кароткая, 2 Даезды.

Валадарскі выбарчы ўчастак № 7 з цэнтрам — вул. 17 верасня (памяшканне школы) з вуліцамі: Грабоўская, Мурманская, Валадарскага, Прамая, Пагодняя, Сверковая, Газетная, Паўднёвае шасе, алея 17 верасня, Стэпавая, Паўднёва-Заходняе шасе, Белавежская, Тавары́ская, Міцкевіча ад Чэхава да Паўднёва-Заходняга шасе, Звярынец.

У Чыгуначнай выбарчай акрузе № 7 па выбарах дэпутатаў у абласны Совет

Гогалеўскі выбарчы ўчастак № 1 з цэнтрам — Жаўтхоўскае шасе, (клуб чыгуначнікаў) з вуліцамі: Жаўткоўскае шасе, Рэймонта, Гогалеўская, Спакойная, Слясарная, Кандуктарская, Грунтавая, Даезд.

Некрасаўскі выбарчы ўчастак № 2 з цэнтрам— Жаўткоўскае шасе (дом № 10, памяшканне канторы чыгуначнай сувязі) з вуліцамі: Правіянтавая, Некрасава, Кобрынская, Карла Лібкнехта, Плоская, Фрунзе.

Чайкоўскі выбарчы ўчастак № 3 з цэнтрам— вул. Урыцкага (дом № 49, школа № 2) з вуліцамі: Паравозная, Чайкоўскага, Кастрычніцкая ад Паравознай да Суконнай, Варонняя.

Урыцкі выбарчы ўчастак № 4 з цэнтрам — вул. Урыцкага (дом № 49, памяшканне школы № 2) з вуліцамі: Сасновая ад Суконнай да канца, Суконная, Калішская, Блізкая, Марозава, Урыцкага ад Стучынскай да Ломжынскай, Ломжынская, Пабедная, Плеханава ад Урыцкага да Млыновай, Бажантарская, Апанскага, Урыцкага ад Калішскай да Апанскага, Урыцкага ад Апанскага да Пабеднай.

Чырвонафлоцкі выбарчы ўчастак № 5 з цэнтрам — Млыновая вул. (дом № 56, памяшканне школы майстэрань дзетдома) з вуліцамі: Млыновая да канца, Стучынская, Варэцкая, Паўднёвае шасе ад Млыновай да канца, Азоўская, Чырвонафлоцкая, Дэповая.

Старасельскі выбарчы ўчастак № 6 з цэнтрам — вул. Плеханава (дом № 21/6, другі паверх) з вуліцамі: Старасельская, Сцянкі, Абозная, Пінская, Омская, Паўднёвае шасе ад Мазавецкай да Млыновай, Комсамольская ад Паўднёвага шасе да Белінскага, Осіпенка, Валынская, Падольская, Шэўрэнда, Белінскага, Данчэнка, Мопраўская, Доўгабродская, Станіслаўская, Палецкая, Зельная, Заходняя, Пагодняя.

Сельскі выбарчы ўчастак № 7 з цэнтрам — вул. Сельская (дом № 41 будкантора) з вуліцамі: Сельская, Карэльская, Лісавая, Плеханава ад Паўднёвага шасе да Сельскай.

Менжынскі выбарчы ўчастак № 8 з цэнтрам — вул. 17-га Верасня (памяшканне школы) з вуліцамі: Кавалерыйская, Вясенняя, Гарадняны — цагельня, Сонечная, Грушавая, Паштовая, Астраханская, Соўгасная ад Сельскай да Курскай, Кранштадская, Ульянава, Кааператыўная, Менжынскага ад Кавалерыйскай да Курскай, Новая, Гараднянская, Паўднёвая, Спартыўная, Менжынскага ад Курскай да Заходняй, Крутая, Соўгасная ад Курскай да Заходняй, Жэромскага.

У Першамайскай выбарчай акрузе № 8 па выбарах дэпутатаў у абласны Совет

Чыгуначны выбарчы ўчастак № 1 з цэнтрам — Ветраковая вул. (дом № 16, чыгуначная школа) з вуліцамі: Ветраковая, Агароднічанская, Рамесленая, Асоавіяхімаўская, Шырокая, Чыгуначная, Выбаргская, Стальная, Харашчанская, Вербная, Клары Цэткін, Кнышынская, Ястрабіная, Дабрынеўская.

Чапаеўскі выбарчы ўчастак № 2 з цэнтрам — Чапаеўская вул. (дом № 30, памяшканне дарсанаддзела) з вуліцамі: Батанічная, Чапаеўская.

Калгасны выбарчы ўчастак № 3 з цэнтрам — Рэволюцыйная вул. (дом № 21, памяшканне канторы леспрамгаса) з вуліцамі: Рэволюцыйная ад Совецкай да Калгаснай, Калгасная, Гарбунова.

Палявы выбарчы ўчастак № 4 з цэнтрам — вул. Палявая (дом № 8, памяшканне школы) з вуліцамі: Палявая, Рэволюцыйная ад № 19 да Беластачанскай і ад № 10 да Беластачанскай.

Загародні выбарчы ўчастак № 5 з цэнтрам — Калгасная вул. (дом № 4, памяшканне 8-й школы) з вуліцамі: Палявая ад № 31 да 47 і ад 30 да 38, Чыстая ад Палескай да Рэволюцыйнай, Загародняя, Маісеенка, Серпухоўскага.

Артылерыйскі выбарчы ўчастак № 6 з цэнтрам — Чапаеўская вул. (дом № 14, памяшканне канторы райтрансторгпіта) з вуліцамі: Артылерыйская, Паўночная, Пераездная, Палеская, Пушачная.

Першамайскі выбарчы ўчастак № 7 з цэнтрам—вул. Беласточак (дом № 1, дзетсад) з вуліцамі: Таганрогская, Загуменная, Дачная, Сакольская, Малытінская, Першамайская, Беласточак.

Астроўскі выбарчы ўчастак № 8 з цэнтрам — Антанюк-Фабрычны (памяшканне чыгуначнага тэхнікума) з вуліцамі: Ветраная, Высокая, Аўсяная, Укосная, Астроўскага, Дзесяціны.

Увага: Указаныя вышэй выбарчыя ўчасткі ў данай пастанове з'яўляюцца адначасова ўчасткамі і па выбарах у гарадскі Совет дэпутатаў працоўных.

Старшыня Беластоцкага горвыканкома І. РАЖНОЎСКІ.

Сакратар Беластоцкага горвыканкома Ф. ОКУНЬ.

„САМАЎПРАЎЛЕННІ" У БУРЖУАЗНАЙ ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАВЕ

13 месяцаў назад у паветах, гарадах і валасцях заходніх абласцей Беларусі распараджаліся ланцуговыя слугі капіталістаў і памешчыкаў — ваяводы, старасты, бургамістры і войты. Па загаду рыдз-смiглых і складкоўскіх яны выраішалі лёс насельніцтва, гаспадарылі ва ўгоду інтарэсам буржуазіі.

Так званыя органы самаўпраўлення—гарадскія і валасныя рады — нічога агульнага з сапраўдным самаўпраўленнем народа не мелі.

Пілсудчыкі адстайвалі лозунг: «Прагнаць палітыку з органаў самаўпраўлення». Гэта азначала, што гарадскія і валасныя рады павінны былі ажыццяўляць антынародную палітыку пілсудскіх і складкоўскіх, палітыку капіталістаў і памешчыкаў.

Эндэкі, якія маскіраваліся апазіцыйнымі фразамі ў адносінах да ўрада пілсудчыкаў, сумесна з імі зніжалі зарплату комунальных рабочых і служачых, перакладалі ўвесь цяжар падаткаў на гарадскую беднату, пазбаўлялі дапамогі беспрацоўных, закрывалі школы прыгнечаных народаў: украінскія, беларускія, яўрэйскія.

Неаднаразова комунальным рабочым прыходзілася доўга і ўпорна змагацца супроць эксплаататарскай палітыкі буржуазных магістратаў.

У 1936 годзе баставалі рабочыя, занятыя на гарадскім будаўніцтве ў Гродне, якія пратэставалі супроць нечуванай эксплаатацыі. У тым-жа годзе больш месяца баставалі беластоцкія рабочыя, занятыя на рэгуляванні ракі Белай, дабіваючыся павышэння нішчанскай зарплаты. Беластоцкі староста і прэзідэнт горада Навакоўскі паслалі супроць рабочых паліцыю.

ППС і Бунд у час выбарчых кампаній у гарадскія рады абманвалі працоўных лозунгамі: «Пабудаваць соцыялізм на гарадскім участку». У дэмагагічных адозвах яны абяцалі бяздомным кватэры, работу беспрацоўным.

Але ў поўмільённай Лодзі, дзе магістрат доўгі час быў у руках пэпэсаўцаў, беспрацоўныя дарэмна дабіваліся работы, бяздомныя жылі ў брудных драўляных бараках на прадмесці Маня, а комунальныя рабочыя неаднаразова баставалі, дабіваючыся паляпшэння сваіх цяжкіх умоў.

Эндэкі, пілсудчыкі, пэпэсаўцы, бундаўцы забяспечвалі ў гарадах эксплаатацыю краявому і замежнаму капіталу. Комунальныя прадпрыемствы знаходзіліся ў руках акцыянерных таварыстваў. Так, напрыклад, у Лодзі трамвай належаў польскім і замежным капіталістам. Тое-ж самае было і з гарадскім аўтобусам у Вільне і з электрастанцыямі ў большасці гарадоў. У Беластоку электрастанцыя знаходзілася ў руках бельгійскіх і польскіх капіталістаў. Іх эксплаататарская палітыка была невыноснай, цэны за электрычнасць былі настолькі высокія, што працоўныя не маглі ёю карыстацца.

Паны навакоўскія, пятроўскія, сорваткі і іншыя буржуазныя главары гарадской рады Беластока былі надзвычайна скупыя, калі справа датычылася інтарэсаў народных мас. У 1938 годзе прэзідэнт Навакоўскі заявіў: «370 тысяч злотых на соцыяльнае забеспячэнне, гэта люксус, які Беласток сабе не можа дазволіць».

Дзесяткі гарадоў, у тым ліку Варшава, Люблін, Радом, Беласток, былі ў кабале краявых і замежных банкіраў. Запазычанасць Беластока ў банках складала ў 1938 годзе 5.300 тысяч злотых. Характэрна, што сам бюджэт, праектыраваны на 1939 год, быў нават некалькі меншы, чым гэта запазычанасць, і складаў 5.200 тысяч злотых. Зразумела, што плацяжы і проценты ад гэтых пазык кладліся цяжкім ярмом на плечы працоўных, складаючы штогодна 400 тысяч злотых.

Урад капіталістаў і памешчыкаў рабіў усё, каб не дапусціць у гарадскія самаўпраўленні прадстаўнікоў рабочага класа. У 1927 годзе пад комуністычным спіскам кандыдатаў у Варшаве былі сабраны тысячы подпісаў. Пілсудчыкаўская-ж выбарчая камісія гэты спісак анулiравала. Не гледзячы на гэта, пролетарыят Варшавы аддаў на гэты спісак звыш 70 тысяч галасоў, а на анулiраваны комуністычны спісак у гарадскую раду ў Лодзі галасавала 48 тысяч рабочых.

У дзесятках і сотнях гарадоў, у якіх пілсудчыкі не мелі большасці, гарадскія рады былі разагнаны і назначаны ўрадавыя камісары, палкоўнікі, маёры і іншыя сапоўнікі.

Працэс фашызацыі ўзмацняўся. У 1934 годзе адбыліся выбары ў гарадскія і валасныя рады ўжо на аснове новага рэакцыйнага закона.

Грамадзяне да 24 год былі пазбаўлены права галасавання. Для таго, каб быць абраным, трэба было мець 30 год. Кандыдат у члены самаўпраўлення павінен быў ведаць польскую мову, гэта значыць не толькі гаварыць, але і пісаць. Такім чынам немагчыма было трапіць у кандыдаты беларускаму і ўкраінскаму селяніну, або яўрэйскаму рабочаму і саматужніку. Але і польскаму рэволюцыйнаму рабочаму і інтэлігенту не лёгка было вытрымаць экзамен пісьменнасці перад пілсудчыкаўскай выбарчай камісіяй, якая звычайна складалася з чыноўнікаў, суддзяў, фабрыкантаў і купцоў.

Апрача гэтага кандыдат, калі ён з'яўляўся рабочым, саматужнікам, працоўным інтэлігентам, павінен быў жыць на тэрыторыі данага горада або воласці, па крайняй меры, адзін год. Гэта ўмова не датычылася землеўладальнікаў і домаўладальнікаў, духоўнікаў усіх веравызнанняў і дзяржаўных чыноўнікаў.

На выбарчым спіску неабходна было сабраць сотні подпісаў, бо трэба было разлічваць, што выбарчая камісія ўсёроўна большасць з іх забракуе. На ўнясенне выбарчага спіска камісія давала, асабліва ў малых гарадах, усяго адзін дзень. А затым камісія пачынала «праверку» праўдзівасці подпісаў на спіску. Так, напрыклад, у Пружанах у 1934 годзе паліцыя выклікала ўсіх, хто падпісаў рабоча-сялянскі спісак, прымушала адказвацца ад подпісаў, а хто не згаджаўся, таго арыштоўвала. У Прушкове ў 1934 годзе ўсіх грамадзян, якія падпісалі апазіцыйныя спіскі, выклікалі ў выбарчую камісію на 5 гадзін. Прыбыла вельмі многа людзей. Хто паяўляўся перад камісіяй на 1 мінуту да 5 або пасля 5 гадзін, таго прозвішча выкрэслівалі, анулiруючы, такім чынам, выбарчыя спіскі.

Паліцыя арыштоўвала рэволюцыйных агітатараў, а эндэкі і пілсудчыкі забівалі рабочых. У час выбараў у гарадскую раду ў Беластоку ў 1934 годзе быў зверска забіт рабочы-ткач М. Люблінскі.

У гарадах заходняй Беларусі, асабліва ў невялікіх, выбары зусім не адбыліся. У Баранавічах староста анулiраваў усе спіскі, акрамя ўрадавага; у Скідэлі і Пружанах старасты дагаварыліся з мясцовай буржуазіяй стварыць адзін спісак. Тады ўрадавае тэлеграфнае агенцтва шумна паведамляла, што ў даных гарадах «усё грамадства не хоча класавай барацьбы і падтрымлівае ўрадавы спісак».

Выбарчыя акругі былі размешчаны так, каб разбіць кварталы, у якіх жыло рабочае насельніцтва, і не даць прадстаўніцтва беларусам, украінцам і яўрэям. У Ломжы ў час выбараў у самаўпраўленне было створана 6 выбарчых акруг. Акругі, у якіх было рабочае насельніцтва, маглі абраць 3—4 кандыдатаў, а іншыя — па 7 кандыдатаў.

Зразумела, што выбары не адбываліся без вядомых «цудаў» над урнай. Напрыклад, у горадзе Влацлавек у 1934 годзе у 1-й выбарчай акрузе было 1294 выбаршчыкі, а бюлетэняў з кандыдатамі ўрадавага блока аказалася ў урне... 1856. У III-й выбарчай акрузе было выбаршчыкаў 1416, а бюлетэняў—1531.

Калі ў 1937 годзе ўрад зрабіў выбарчы закон яшчэ больш рэакцыйным, тады ў наступных выбарах у самаўпраўленні ў 1938 і 1939 годзе працоўныя прынялі вельмі малы ўдзел. Напрыклад, у выбарах у гарадскую раду ў Варшаве ў 1938 годзе ўдзельнічала 41,9 процанта выбаршчыкаў.

У Заходняй Беларусі ў 1938—39 годах, асабліва ў вёсках, выбары амаль не адбыліся. Калі ў Беластоку ў маі 1939 года былі праведзены выбары ў гарадскую раду, тады на 48 членаў рады папала там усяго толькі 3—4 рабочых.

Беластоцкая гарадская рада сабралася на пасяджэнні ўсяго толькі два разы.

Разам з рыдзамі, бекамі і складкоўскімі зніклі і ваяводы, старасты, буржуазныя бургамістры і прэзідэнты гарадоў.

Вызвалены народ зможа зараз свабодна паслаць сваіх сапраўдных прадстаўнікоў у свае дзяржаўныя органы — Советы дэпутатаў працоўных.

С. Натансон.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ПАРТЫЙНЫ СХОД—ШКОЛА ВЫХАВАННЯ КОМУНІСТАЎ

Сапраўднай школай большэвіцкага выхавання партыйны сход можа стаць толькі тады, калі ён добра падрыхтаван. Таму ў часці, дзе сакратаром партбюро тав. Рыжкоў, падрыхтоўцы да сходаў удзяляецца выключна вялікая ўвага.

14 кастрычніка, за тры дні да назначанага чарговага партсхода, тав. Рыжкоў паведаміў комуністам аб павестцы дня, правёў гутаркі з парторгамі падраздзяленняў і членамі партыі—актывістамі. З імі ён гаварыў не толькі аб самой павестцы дня, але і аб змесце ўзнімаемых пытанняў, даў парторгам і актывістам заданне як след падрыхтавацца да схода, абдумаць свае прапановы. Парторгі і актывісты ў сваю чаргу правялі гутаркі з радам комуністаў на тыя-ж тэмы.

У выніку сход прайшоў пры вялікай актыўнасці прысутных, на высокім палітычным узроўні. Актыўна выступаючы ў спрэчках, члены і кандыдаты партыі ўнеслі нямала каштоўных прапаноў па дакладу.

На гэтым сходзе ўпершыню выступіў малады комуніст тав. Севасцьянаў. Ён таксама ўнёс некалькі каштоўных прапаноў.

Добрай школай для комуністаў з'явіўся таксама сход у падраздзяленні, дзе парторгам тав. Мельнікаў. У гэтай партарганізацыі комуніст тав. Кайтукоў слаба працаваў над сабой па павышэнню тэарэтычнага ўзроўню. Партарганізацыя рашыла гэта пытанне абмеркаваць на чарговым партыйным сходзе. Да схода рыхтаваліся ўсе комуністы. Парторг тав. Мельнікаў паведаміў аб сходзе за некалькі дзён да яго пачатку. Пры дапамозе намесніка камандзіра па палітчасці ён правёў гутарку з кожным комуністам у паасобку, даведаўся, як яны працуюць над павышэннем свайго палітычнага ўзроўню, над вывучэннем «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

На сходзе комуністы падверглі рэзкай крытыцы тав. Кайтукова. Для аказання практычнай дапамогі ў палітычнай вучобе да тав. Кайтукова быў прымацаван комуніст тав. Янчэнка.

Зараз тав. Кайтукоў значна лепш працуе над сабой. Партыйны сход з'явіўся для яго, як і для ўсіх астатніх комуністаў арганізацыі, сапраўднай школай большэвіцкага выхавання.

Ал. Окунеў.

—о—

КУРСЫ АГІТАТАРАЎ

Пры гродненскім партыйным кабінеце закончылі работу пяцідзённыя курсы агітатараў нізавога звяна. Вучобай было ахоплена 40 чалавек. Агітатары—стаханаўцы прадпрыемстваў тт. Іваноў, Гольдман, Пташкоўскі, Шмігельскі і рад іншых праслухалі цыкл лекцый аб Сталінскай Канстытуцыі і Палажэнні аб выбарах. Заняткі праводзіў кансультант гаркома партыі тав. Хейман.

С. Пэртной.

Сход комсамольскага актыва горада Беластока

23 кастрычніка адбыўся сход комсамольскага актыва горада Беластока. Па пытанню, якому быў прысвечан сход,—аб выніках работы XIV з'езда комсамола Беларусі — зрабіў даклад сакратар абкома комсамола тав. Стрыжак.

Дакладчык расказаў аб вялікіх поспехах комсамола Беларусі, аб слаўных справах комсамольцаў на гаспадарчых і баявых франтах. З'езд адзначыў дасягненні комсамола ў абаронна-фізкультурнай рабоце. У 1940 годзе 30 тысяч комсамольцаў авалодалі ваеннымі спецыяльнасцямі. Лепшыя комсамольцы Беларускай арганізацыі ў радах Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота праяўляюць мужнасць і самаадданасць у справе ўмацавання ваеннай магутнасці соцыялістычнай дзяржавы. Многія комсамольцы за апошні год атрымалі ордэны і медалі за храбрасць і гераізм у барацьбе з ворагамі Совецкага Саюза. Комсамольцам Кузякіну, Нечаеву, Гармоза, Саламоннікаву прысвоена званне Героя Совецкага Саюза.

Дакладчык гаворыць пра работу комсамола ў заходніх абласцях БССР. Комсамол Беларусі паслаў для работы ў заходнія абласці 7.275 комсамольцаў. Комсамольцы працуюць на важнейшых участках соцыялістычнага будаўніцтва, абароны краіны, на фронце культуры і асветы. У будаўніцтве Днепра-Бугскага канала, у скорасным будаўніцтве дарог і іншым важнейшым будаўніцтве—многа працы і энергіі комсамольцаў.

Гаворачы аб працоўным энтузіязме моладзі, дакладчык разам з тым спыняецца на выкананні Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня.-Хоць працоўная дысцыпліна сярод комсамольцаў значна ўмацавалася, аднак у Беластоку за апошні час наглядаецца шкоднае супакаенне ў справе кантролю за выкананнем Указа. Нарушальнікі дысцыпліны сярод комсамольцаў дзе-ні-дзе яшчэ сустракаюцца. Шкада, што тав. Стрыжак не назваў актыву канкрэтных нарушальнікаў Указа.

Не ліквідавана ў пярвічных комсамольскіх арганізацыях Беластока арганізацыйная распушчанасць. Комсамольскія сходы, сходы актыва часта праводзяцца са спазненнем, нярэдка на нізкім узроўні. 11 верасня на гарадскую нараду сакратароў комсамольскіх арганізацый з'явілася 9 чалавек, а 50 чалавек зусім не прышлі. Каб у гаркоме сабраць актыў ці сакратароў пярвічных арганізацый, трэба патраціць многа энергіі і часу. Нават сённешні сход актыва, не гледзячы на шырокавяшчальнае аб'яўленне, пачаўся з спазненнем. Комсамольскі сход—вышэйшы орган арганізацыі, і ён павінен праводзіцца на высокім палітычным узроўні.

Комсамольская гаспадарка ў пярвічных арганізацыях не прыведзена яшчэ ў належны парадак, не пэкончана з пратэрміноўкамі ва ўплаце членскіх узносаў.

У палітычна-выхаваўчай рабоце сярод комсамольцаў і несаюзнай моладзі, марксісцка-ленінскай вучобе актыва комсамольская арганізацыя Беластока не дасягнула больш-менш значнага поспеху. Комсамольцы павінны стаць сапраўднымі важакамі несаюзнай моладзі, заваяваць уплыў і аўтарытэт у масах моладзі, прыцягнуць яе на свой бок. Моладзі ва ўмовах капіталістычнага ладу ў былой Польшчы прывіваліся і культываваліся нацыяналізм, шавінізм, прыватнаўласніцкія, эгаістычныя звычкі. Воўчы закон канкурэнцыі, кар'ерызм штурхаў моладзь на ўсё ў барацьбе за існаванне, за жыццёвую кар'еру. Вось гэтай моладзі зараз і трэба дапамагчы скінуць чорны груз мінулага, упорна і ўмела выхоўваць у яе дружбу і таварыскасць, інтэрнацыяналізм і калектывізм, выхоўваць моладзь у соцыялістычнай свядомасці і культуры, у духу вернасці і адданасці совецкай уладзе, прывіваць і культываваць совецкі патрыятызм.

Комсамол горада не падышоў бліжка да школьнай моладзі, не жыве яе інтарэсамі.

Зараз вялікая задача комсамола—дапамагчы ва ўкамплектаванні школ Фабрычна-Заводскага Абучэння і Рамесленых вучылішчаў. Трэба падабраць лепшую моладзь для вытворчага абучэння, дапамагчы абсталяваць школы, абсталяваць інтэрнаты для вучняў.

Трэба ўзорна паставіць абаронна-фізкультурную работу.

Прыняць самы актыўны удзел у кампаніі па выбарам у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Трэба дабіцца, каб кожны комсамолец працаваў агітатарам, каб агітацыя прыняла баявы, наступальны характар.

Выступаючыя ў спрэчках дапоўнілі дакладчыка канкрэтнымі прыкладамі работы пярвічных арганізацый. Сакратар пярвічнай комсамольскай арганізацыі 1-га тэкстыльнага камбіната тав. Дзядзечкіна гаварыла аб арганізацыйнай неўпарадкаванасці арганізацыі. Восем комсамольцаў не прадставілі яшчэ сваіх асабовых спраў з тых арганізацый, адкуль яны перавяліся. Многія комсамольцы не выконваюць комсамольскія даручэнні.

Комсамольскі арганізатар 3-й школы тав. Папова сказала, што комсамольцы ў школе павінны асабліва праявіць сябе як памочнікі настаўнікаў у наладжванні дысцыпліны і вучобы.

Сакратар пярвічнай арганізацыі 2-га камбіната тав. Радкевіч гаворыць аб рабоце комсамольцаў па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы. Комсамольцы праводзяць у цэхах гутаркі па вывучэнню Палажэння аб выбарах, Сталінскай Канстытуцыі і гутаркі на агульнапалітычныя тэмы. А вось тэхнічная вучоба комсамольцаў пастаўлена слаба.

У спрэчках выступілі сакратары пярвічных арганізацый тт. Бабакова (5-ы камбінат), Палтаран (аблземаддзел), Шарэбаў (будучастак) і сакратар гаркома комсамола тав. Баркун. Сход прайшоў на высокім палітычным узроўні. У сваім рашэнні па дакладу тав. Стрыжака сход абавязаўся па-большэвіцку змагацца за выкананне рашэнняў XIV з'езда ЛКСМБ.

І. Клінаў.

—«о»—

Вылучаны прадстаўнікі ў акруговыя камісіі

Гэтымі днямі на 2-м беластоцкім тэкстыльным камбінаце адбыўся сход рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў па пытанню аб вылучэнні прадстаўнікоў у акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у гарадскі і абласны Совет дэпутатаў працоўных. На сходзе прысутнічала 500 чалавек.

Пасля кароткай інфармацыі дырэктара камбіната тав. Янчука, выступілі тт. Ханін, Муравецкая, Юткес, Арлоўскі і Левітан. Яны прапанавалі вылучыць у акруговыя выбарчыя камісіі наступных таварышоў: стаханаўца-ткача — Берыло І., лепшага рабочага фарбавальнага цэха — І. Юдэлевіча, дзесятніка будаўнічых рабочых — О. Мушынскага, падмайстра ткацкага цэха і члена фабкома — І. Абрамовіча і адну з першых стаханавак камбіната, старшыню совета соцыяльнага страхавання — М. Фурман.

Прысутныя аднадушна галасавалі за вылучэнне гэтых таварышоў у акруговыя выбарчыя камісіі. Калектыў рабочых 2-га камбіната абавязаўся прыняць актыўны ўдзел у выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Н. М.



Старэйшы інструктар школы ФЗА, рэарганізуемай у рамесленае вучылішча, завода «Чырвоны пролетарый» (Масква) тав. Г. Балакірэў з вучнямі. Злева направа: А. Крэпінін, В. Казлоў, Г. Балакірэў Б. Букавін і В. Шайкін. Фота В. Шароўскага. Фота ТАСС.

Навесці большэвіцкі парадак

У трэсце «Галоўмаслапром» спакойна. Тут не спяшаюцца. Нават кіраўнік трэста тав. Жлоба і яго намеснік Сінатаў (ён-жа і парторг) таксама не турбуюцца.

Як не дзіўна, у трэсце да гэтага часу не наладжан учот прыходу і ўходу з работы.

У «Галоўмаслапроме» не вядзецца барацьба за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны, за рэалізацыю Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня.

Трэст закупіў 12 тон сернай кіслаты для правядзення аналізаў малака. Кіслата была разаслана па раёнах для скарыстання яе. І толькі пасля выяснілася, што яна не той удзельнай вагі, якая патрэбна. У выніку гэтага каля двух месяцаў вытворчыя адзінкі не маглі весці ўчоту, вызначаць тлустасць малака і, значыцца, правільна весці грашовыя разлікі з здатчыкамі малака.

Наогул, заводы, якія падпарадкаваны «Галоўмаслапрому», у сваёй рабоце маюць рад недахопаў: выпрацоўваемая прадукцыя нізкай якасці і хаваецца не ў лядоўнях, а ў цэхах. Гэта сказваецца на якасці прадукцыі. Хаця адпушчана больш 300 тысяч рублёў на пабудову лядоўняў, аднак гэтыя сродкі не выкарыстаны.

А. Лук'янаў.

Чыгуначнае вучылішча ў Беластоку

Школа фабрычна-заводскага абучэння Беластоцкай чыгункі цяпер рэарганізуецца ў чыгуначнае вучылішча з кантынгентам навучаючыхся ў 200 чалавек. Рэарганізацыя школы праводзіцца без перапынку ў вучобе.

Ідзе падрыхтоўка да адкрыцця вучылішча. Пасля рамонту здан ужо ў эксплаатацыю сталярны цэх. У трох прасторных пакоях размешчан слясарны цэх. У ім будзе 125 рабочых месц. У новае памяшканне перанесен механічны цэх. Поўнасцю адрамантаваны класныя пакоі.

Вучылішча забяспечана настаўніцкімі кадрамі з ліку інжынераў і тэхнікаў чыгуначнага транспарта.

Як на 2-м камбінаце рыхтуюцца да зімы

Неаднаразова на 2-м тэкстыльным камбінаце абмяркоўвалася пытанне аб падрыхтоўцы да зімы. І сапраўды, у гэтай галіне прадстаіць зрабіць вельмі вялікую работу: трэба ацяпліць цэх, зашкліць вокны, падрыхтаваць паліва і іншае.

Як-жа гэта работа праходзіць на 2-м камбінаце?

З слоў намесніка дырэктара тав. Юндава відаць, што з палівам як быццам усё ў парадку. На самай справе падрыхтоўка да зімы выклікае трывогу. Прадзільны цэх патрабуе рамонту некалькіх аконных рам. Але гэтая работа яшчэ не праведзена. Праведзены ў інтэрнаце камбіната рамонт — нядобраякасны, зробленыя печкі—непрыгодныя. Тут адсутнічаюць двайныя рамы ў вокнах. А трэба ўлічыць, што ў інтэрнаце жыве 20 чалавек.

Дырэкцыі камбіната неабходна прыняць усе захады, каб узорна падрыхтавацца да работы ў зімовых умовах.

К. Іваноў.

На слядах нашых матэрыялаў

„БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ"

Пад такім загалоўкам у нашай газеце за 8 кастрычніка была змешчана заметка, у якой указвалася, што намеснік начальніка Лестрансгаса на станцыі Чорная Весь Зюкаў разбазарвае дзяржаўныя сродкі, у прыватнасці, купіў за тысячу рублёў калёсы, якія аказаліся паламанымі, а за рамонт іх зноў трэба заплаціць вялікую суму грошай.

Як паведаміў нам начальнік беластоцкага Лестрансгаса, факты, указаныя ў заметцы, адпавядаюць сапраўднасці. За безгаспадарчасць Зюкаў з работы зняты.

А. ФАДЗЕЕЎ

Пісьмо*)

Чырвонаармейцы, якія ўцяклі з палону, прынеслі ў Скабееўку пісьмо абласнога камітэта і нейкі невялікі мяккі скрутак, перавязаны сіненькай забрудніўшайся ў дарозе тасёмкай.

— Хто вам гэта перадаў?—распытваў Алёша, пакуль старшы чырвонаармеец выпарваў з ватніка пісьмо, а Філіп Андрэевіч нягнучыміся шахцёрскімі пальцамі развязваў скрутак.

— Жанчына перадала, светленькая такая, — адказваў чырвонаармеец, — нібы ўгадаўшы таемны сэнс пытанняў Алёшы. — І разумненькая такая: «Пісьмо, — гаворыць, — і скрутак дала вам адна паненка незнаёмая, пераслаць пры выпадку ў сяло бацьку, папу. Памятайце гэта, — гаворыць, — калі ўлопаецеся»...

— Ай-я-яй, гэта-ж чулкі, ды цёплыя якія! — усклікнуў Марцем'янаў, у абодвух руках падаючы Пятру і Алёшу пару тоўстых шарсцяных наскоў.

Пётр моўчкі распячатаў пададзены яму чырвонаармейцам жоўты канверцік. У канверце было два невялікіх пісьмы — адно звычайнае, ад Соні, другое — з адных лічбаў, выпісаных слупікамі.

Пётр, прабяжаўшы вачыма пісьмо ад Соні, прачытаў яго голасна:

Мілы тата!

Не магу сказаць Вам, як бясконца хвалюемся мы аб Вас усіх, воляю Божай асуджаных жыць сярод гэтых людзей, страціўшых Бога і не маючых сэрца. У гімназіі ў нас усё ў парадку, я вучуся добра, але, ах, навошта гэтае вучэнне, калі я разлучана з усімі Вамі і мілым Алёшанькам, якому я буду вернай на гроб жыцця майго!

Тата! Дзядзя Валодзя загадаў напісаць Вам, каб Вы не рвалі паперы ваенных пазык, бо, ён гаворыць, хутка, хутка ўсё павернецца на старое і будуць плаціць па ўсіх паперах, і загадаў мне спісаць усе нумары, якія яшчэ ў сіле, і я Вам іх усе пасылаю.

А яшчэ цалую я маму, дзядзю Андрэіча, брата Пеценьку, а ў Вас цалую руку і прашу благаславення. І яшчэ прашу перадаць Алёшаньку з яго рэўматызмам наскі, наскі амерыканскія. Амерыканцы вельмі заігрываюць з намі, але ўсе прыяцелькі гавораць, што яны людзі няверныя, а больш можна верыць японцам, якіх, гавораць, скора прыбудзе вельмі многа.

Кідаю пісаць, бо вялікая навальніца ідзе з захада, вунь нават салдацікі бягуць.

Астаюся любячая і безуцешная, але не хачу раптаць, бо Хрыстос пасля ўсіх яго пакут прабывае сярод нас і суцяшае нас грэшных. Амінь.

Ваша Соня.

Увесь час, пакуль Пётр з сур'ёзным выражэннем твара чытаў гэтае пісьмо, у пакоі рогат стаяў: смяяўся Алёша, расчулены клопатамі Соні, смяяўся і кашляў Марцем'янаў, які зразумеў, што дзядзя Андрэіч, якому Соня слала пацалунак, гэта ёсць ён — Філіп Андрэевіч, смяяліся ўсе чырвонаармейцы. Але толькі Пётр і Алёша разумелі няўлоўны гумар і ўсю сур'ёзнасць гэтага пісьма, у якім ні адно слова не было напісана марна і якое змяшчала кучу самых важных палітычных і асабістых навін.

Па пісьму ясна было, што ўсіх іх памятаюць, хвалююцца аб іх, і што ўсе, а асабліва Соня, хочуць папасці сюды. У «гімназіі» было ўсё ў парадку, гэта значыць новых правалаў у камітэце не было, і Соня «вучылася добра», гэта значыць не была адкрыта, і можна было прытрымлівацца старога шляху сувязі з камітэтам.

Але галоўных навін было тры: «амерыканцы людзі няверныя» і «больш можна верыць японцам» якіх «скора прыбудзе вельмі многа», азначала, што трэба чакаць — і чакаць у хуткім часе вялікай колькасці японскіх войск, перакідванню якіх не будуць перашкаджаць амерыканцы. «Вялікая граза ідзе з захада, вунь нават салдацікі бягуць», азначала, што наступленне совецкіх войск развіваецца паспяхова і Калчак адступае. А ўпамінанне аб «Дзядзю Валодзю»—найбольш буйным работніку з сядзячых у турме, які «загадаў спісаць усе нумары папер, якія яшчэ ў сіле», гэта значыць, якому належала другое, зашыфраванае пісьмо,—і апошняя ўцяшальная заўвага пісьма, што «Хрыстос (мянушка другога буйнага работніка) пасля ўсіх яго пакут знаходзіцца сярод нас і ўцяшае нас грэшных», гэта значыць уцёк з турмы і кіруе работай, —гэтыя месцы пісьма гаварылі аб тым, што камітэт аднавіў сувязі з турмой.

У пісьме Соні была яшчэ такая дзіўная прыпіска:

Тата. Калі будзе аказія, прышлі мне сваю «Ж. ж.» Бр. Тут нідзе няма, а мне трэба да экзаменаў.

Гэтую прыпіску Пётр не агласіў. Гэтая прыпіска была адказам на пісьмо Пятра, паведаміўшага Соні на яе запытанне спісак рэдкіх кніг, якія ён мае ў сваім распараджэнні (ён карыстаўся бібліятэкай Уладзіміра Грыгор'евіча). Прыпіска азначала, што з рэдкіх кніг, якія ён мог мець у сваім распараджэнні, ключом да новага шыфра ўзята «Жыццё жывёлы» Брэма.

Пётр і Алёша, бязлітасна курачы, расшыфроўвалі пісьмо да глыбокай ночы, а Марцем'янаў, у вопратцы і ботах, то засыпаў на сваім ложку, то прачынаўся і пытаў — «ці хутка», а яму ўсё гаварылі — «ды раздзенься ты, радзі бога», — і ён зноў засыпаў у вопратцы і ботах. Гадзіны ў тры ён заснуў моцным дзіцячым сном, але хутка яго разбудзілі.

Акно было раскрыта, сырое начное паветра ўпаўзала ў напоўнены дымам пакой. Алёша і Пётр з успаленымі адсутнічаючымі вачыма стаялі над Марцем'янавым, урачыста і пачціва трымаючы ў руках листкі.

— Гатова? — спалохана вытарашчыўшы са сна сіняватыя прастадушныя вочы, ускрыкнуў Філіп Андрэевіч і зняў з койкі крывыя ў брудных ботах ногі.

— Да, брат, ёсць над чым падумаць! — Ці то збянтэжана, ці то з некаторым здзіўленнем і нават захапленнем гаварыў Алёша.

Яны селі на койку супроць Марцем'янава, і, заглядаючы ў лісткі адзін другому, па чарзе, як яны запісвалі, прачыталі ўголас пісьмо работнікаў абласнога камітэта, сядзячых у турме.

... Некаторы час Пётр, Алёша і Філіп Андрэевіч сядзелі моўчкі, не гледзячы адзін на другога.

Ні адзін кароль, цар, прэзідэнт або які-небудзь іншы кіраўнік сучаснай буржуазнай дзяржавы і ніякі папа, банкір або закон ніколі не мелі і не маглі мець такой улады над сваімі падначаленымі, якую невялікая група людзей, сядзячых за тоўстымі каменнымі сценамі, за сям'ю замкамі, за мноствам вартавых і наглядчыкаў, — мела на Пятра, Алёшу і Марцем'янава, а праз іх на дзесяткі і сотні, а праз гэтых на дзесяткі і сотні тысяч паўстаўшых людзей.

Улада гэтая была прызнана Пятром, Алёшай і тымі, хто ішоў за імі, добраахвотна і была аснавана на сіле простай разумнай мыслі, ачышчанай ад усякіх пабочных меркаванняў і таму зусім бясстрашнай, мыслі настолькі жыццёва праўдзівай, гэта значыць настолькі адпавядаючай ходу самога жыцця і імкненням людзей, што яна набывала характар матэрыяльнай сілы.

Пасля ўсіх афяр, цяжкасцей, напружання сіл, сумненняў, разнагалоссяў, Пётр, Алёша, Марцем'янаў бачылі дзякуючы гэтаму пісьму, што яны жылі і працавалі не дарэмна, і бачылі перад сабой ясную мэту і шлях да яе.

Прастата і яснасць пісьма былі такія, што ўсім тром здавалася, што кожны з іх, па сутнасці, думаў іменна гэта. Ім нехапала якогасьці «ледзь-ледзь», каб гэтае-ж самае выразіць. І вось, калі паявілася гэтае «ледзь-ледзь», аказалася, што ўсе яны думаюць адно і спрачацца ім, сапраўды, няма аб чым.

Не гледзячы на тое, што пісьмо, несумненна, папраўляла іх усіх (больш за ўсё Алёшу, але і Пятра і тых, хто стаяў за імі), не гледзячы на гэта, кожны знаходзіў у пісьме і тое, што ён прапаноўваў. Не гаворачы ўжо аб Пятру, работа якога была адобрана ў самым галоўным (і які быў шчаслівы, але сароміўся гэта паказаць), і Алёша мог-бы сказаць, што ён прадбачыў японскае наступленне і высунуў думку аб стварэнні харчовых баз у тайзе, а Марцем'янаў, — што ён якраз кіраваў у рэўкоме мужыцкімі справамі і быў галоўным арганізатарам з'езда, аб важнасці якога гаварылася ў пісьме. А Сеня Кудравы, які мучыўся з пытаннем аб тым, як быць са стачкай, не думаў, што рашыць гэтае пытанне іменна так, як раіла пісьмо.

Тое, што людзі, сядзячыя ў турме, выходзілі з іх агульнага жыццёвага вопыту і ў той-жа час уладалі гэтым магічным «ледзь-ледзь», тое, што гэтыя людзі не злавалі на глупствы і памылкі, а вучылі і ўзбадзёрвалі і нават гардзіліся тымі, хто працуе на волі, — усё гэта выклікала ў душы Пятра, Алёшы і Філіпа Андрэевіча глыбокае і чыстае хваляванне, якое яны сароміліся паказаць адзін другому.


— Т-так, нічога не скажаш, — першы прарваў маўчанне Алёша. — І, ведаеш, тут ёсць такія штукі!.. — Ён сарамліва і расчулена пакруціў яжовай сваёй галоўкай і сказаў:—А ну-ка, яшчэ раз прачытаем...

І яны прачыталі пісьмо яшчэ раз, а потым яшчэ раз. І ўсякі раз яно адкрывалася ім усё новымі старанамі. Нават калі яны рашылі «заснуць гадзінку» і леглі ў пасцель, яны доўга яшчэ з незвычайнай адкравеннасцю гаварылі і пра пісьмо, і пра работу. А потым кожны яшчэ доўга не спаў і думаў аб сваім, асабістым, якое раптам таксама стала такім ясным і чыстым перад іх маральным поглядам.

Уснулі яны, калі было ўжо зусім светла.

*) Урывак з 4-й кнігі аповесці «Апошні з Удэге», выпускаемай у бліжэйшы час Дзяржлітвыдатам.

З А Р У Б Я Ж О М



Горад Саутгемптон (Англія), нядаўна бамбардыраваны германскімі самалётамі. Фота ТАСС.

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 25 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае зводку вярхоўнага камандавання германскай арміі: На працягу ўчарашняга дня германскія бамбардыроўшчыкі некалькі разоў бамбардыравалі англійскую сталіцу, самалёты скінулі бомбы таксама на некаторыя порты, прамысловыя прадпрыемствы і чыгуначныя збудаванні ў Паўднёвай частцы Брытанскіх астравоў. Уночы атакі германскіх бамбардыроўшчыкаў былі накіраваны галоўным чынам супроць Лондана. Узніклі пажары і ўзрывы. Уночы германская авіяцыя бамбардыравала таксама цэнтры ваеннай прамысловасці і партовыя раёны Англіі. Працягвалася мініраванне англійскіх партоў. У баявых дзеяннях германскай авіяцыі супроць Англіі ўпершыню прынялі ўдзел злучэнні італьянскіх бамбардыроўшчыкаў, якія стартавалі з баз, размешчаных у акупіраваных раёнах. Італьянскія лётчыкі дабіліся поспеху пры бамбардыроўцы партовых збудаванняў ва ўсходніх раёнах Англіі.

На працягу ночы непрыяцельскія самалёты лёталі над Паўночнай і Заходняй Германіяй. Дзеянні непрыяцельскіх самалётаў былі накіраваны галоўным чынам супроць Гамбурга, дзе ў некаторых раёнах горада і ў парту ўзніклі пажары і прычынен матэрыяльны урон. Пад прыкрыццем воблачнасці нязначным сілам непрыяцеля ўдалося дасягнуць германскай сталіцы. Скінутыя тут бомбы выклікалі нязначныя пажары і прычынілі лёгкія пашкоджанні жылым дамам. Вялікі пажар узнік на адным лясным складзе. У Берліне і Гамбургу налічваецца некальні забітых і раненых.

Збіта 5 непрыяцельскіх самалётаў. Германская і італьянская авіяцыя страт не мелі.

Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, 24 кастрычніка германскія бамбардыроўшчыкі паспяхова атакавалі Лондан, некаторыя порты, размешчаныя на ўсходнім узбярэжжы Англіі, і галоўнейшыя прамысловыя цэнтры Цэнтральнай Англіі. У адным горадзе, які знаходзіцца на паўднёва-ўсходзе ад Лондана, разбураны прамысловыя збудаванні. У Бірмінгаме ў рэзультаце бамбардыроўкі ўспыхнулі многалікія пажары. Мінулай ноччу і сёння раніцай германская авіяцыя зноў працягвала свае налёты на англійскую сталіцу. Скарасныя бамбардыроўшчыкі скінулі на важныя ваенныя аб'екты Лондана бомбы буйнага калібра.

Сустрэча Гітлера з Франко

БЕРЛІН, 24 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае Германскае інфармацыйнае бюро непасрэдна з Францыі, 23 кастрычніка ў другой палове дня Гітлер у суправаджэнні міністра замежных спраў Германіі Рыбентропа, галоўна-камандуючага германскай арміяй генерал-фельдмаршала Браухіча, начальніка вярхоўнага камандавання германскіх узброеных сіл генерал-фельдмаршала Кейтэля і іншых асоб прыбыў спецыяльным поездам на франка-іспанскую граніцу. Праз некаторы час туды прыбыў спецыяльны поезд Франко. Пасля ўзаемных прывітанняў паміж Гітлерам і Франко ў салон-вагоне Гітлера пачаліся перагаворы.

Сустрэча Гітлера з Петэнам

БЕРЛІН, 24 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што сёння ў Францыі Гітлер прыняў маршала Петэна. Пры гутарцы прысутнічалі германскі міністр замежных спраў Рыбентроп і намеснік старшыні французската савета міністраў Лаваль.

Паведамленне „Ньюс кронікл" аб англа-егіпецкім пагадненні

ЛОНДАН, 25 кастрычніка. (ТАСС). Каірскі карэспандэнт газеты «Ньюс кронікл», спасылаючыся на даставерныя крыніцы, паведамляе аб заключэнні пагаднення паміж англійскімі і егіпецкімі ўладамі. Па гэтаму пагадненню Англія прымае на сябе фінансавыя расходы, звязаныя з усімі новымі абароннымі мерапрыемствамі ў Егіпце. Чакаюць, што неадкладна пачнуцца абарончыя работы на суму ў 2 мільёны фунтаў стэрлінгаў.

Раскрыццё буйнай польскай шпіёнскай арганізацыі ў Румыніі

БЕРЛІН, 25 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Бухарэста, што легіянерская паліцыя выкрыла шырока разгалінаваную польскую шпіёнскую арганізацыю ў Румыніі. Пасля таго, як легіянеры зрабілі ўчора вобыск ва ўсіх будынках, якія належалі былой польскай місіі ў Румыніі (за выключэннем самога будынка місіі), быў знойдзен рад новых даных аб раскрытай шпіёнскай арганізацыі і аб яе сувязях з англійскай місіяй. З гэтых матэрыялаў выходзіць, што польская шпіёнская арганізацыя фармальна падпарадкавалася румынскаму аддзяленню англійскай інтэлідженс сервіс. Кіраўніцтва румынскім аддзяленнем інтэлідженс сервіс знаходзілася ў руках англійскага ваеннага аташэ ў Румыніі Мак Наб. Мак Наб пакінуў Бухарэст некалькі дзён таму назад. Адначасова з Румыніі выехала ў Стамбул многа палякаў, якія таксама выкрываюцца знойдзенымі дакументамі. Даказана, што польская шпіёнская арганізацыя фінансіравалася з англійскіх крыніц і забяспечвалася таксама тэхнічным матэрыялам англійскага паходжання (у прыватнасці двума тайнымі радыёперадатчыкамі). Акрамя таго, было ўстаноўлена, што цэлы рад выключна важных дакументаў быў за апошнія дні перанесен у англійскую місію ў Бухарэсце. У так званай арганізацыі «Дапамога польскім бежанцам» быў знойдзен цэнтр па вырабу фальшывых пашпартаў. Акрамя таго, следы вядуць да другога падобнага цэнтра, які знаходзіцца ў памяшканні англійскай місіі. Далей тут-жа быў знойдзен цэлы рад брашур, накіраваных супроць Германіі, і раней усяго супроць яе кіраўнікоў, у прыватнасці супроць Гітлера. Арыштавана каля 100 палякаў, у тым ліку каля 30 членаў так званай польскай місіі.

Легіянерская паліцыя ўжо даўно мела звесткі аб гэтай арганізацыі. Былі знойдзены таксама дакументы, выкрываючыя дзейнасць палякаў пры рэжыме караля Кароля. Аднак гэтыя матэрыялы былі захаваны начальнікам паліцыі пры каралі Каролі. Устаноўлена таксама, што былы начальнік паліцыі і кіраўнік аддзела дзяржаўнай бяспекі генерал Марынеску атрымаў за скрыццё гэтых матэрыялаў вялікія ўзяткі.

—о—

Арышт Рыдз-Смiглы

ЛОНДАН, 25 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што, згодна паведамленню рымскага радыё, былы галоўнакамандуючы польскай арміяй маршал Рыдз-Смiглы арыштаван у Румыніі. У паведамленні ўказваецца, што Рыдз-Смiглы быў інтэрніраван пасля яго прыбыцця ў Румынію ў верасні 1939 года.

У падарунак святу

Калектыў рабочых «Водаканала» актыўна рыхтуецца да прадстаячай XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. На будуючайся цяпер новай пасоснай станцыі работы падыходзяць к канцу.

Рабочыя будаўніцтва насоснай станцыі абавязаліся ў падарунак слаўнай гадавіне да 7 лістапада закончыць будаўніцтва.

—о—

Перадсвяточны кірмаш

З мэтай павелічэння завозу ў горад сельскагаспадарчых прадуктаў, з 1 па 4 лістапада ў Беластоку будзе праведзен перадсвяточны кірмаш.

К кірмашным дням на гарадскія рынкі паступіць многа прамысловых вырабаў.

—о—

Платная лекцыя ў Саколках

Днямі Саколкаўскім раённым камітэтам партыі для партыйната, савецкага і комсамольскага актыва была арганізавана платная лекцыя на тэму: «ППС — дробна-буржуазная, нацыяналістычная контррэволюцыйная партыя».

Лекцыю чытаў лектар Беластоцкага абкома партыі тав. Гракаў.

Р. Найдовіч.

—о—

Прагрaма па рускай мове для польскіх і яўрэйскіх школ

Наркамасветы выдаў спецыяльную праграму па рускай мове для польскіх і яўрэйскіх школ. Ва ўступе праграма рэкамендуе настаўнікам, каб пры навучанні рускай мове заўсёды мелі на ўвазе родную мову дзяцей, яе асаблівасці, правапіс і граматыку.

Праграма прыводзіць рад канкрэтных прыкладаў пераважна з галіны правапісу, адзначае, на што трэба звярнуць асаблівую ўвагу, каб палегчыць працу. Шкада, што ў найбольш важным раздзеле навучання (склоны назоўнікаў і прыметнікаў, займеннікі) няма метадычных указанняў.

Новыя праграмы акажуць значную дапамогу настаўнікам, унясуць большую яснасць у методыку і будуць садзейнічаць лепшым поспехам вучняў у асваенні рускай мовы.

—о—

ЭСТАФЕТА ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ

3-га лістапада ў Беластоку адбудзецца эстафета фізкультурнікаў, прысвечаная XXIII гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі і надыходзячым выбарам у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Дыстанцыя эстафеты — 5.500 метраў. Старт будзе дан ля гарадскога тэатра. Удзельнікі эстафеты пройдуць па вуліцы Міцкевіча, Ожэшка да Чырвонаармейскай, адтуль па вуліцах Чкалава, Совецкай, Свердлова, Беластачанскай, Пралетарскай, Юравецкай, Ленінскай і зноў па Совецкай да тэатра—да фініша.

У эстафеце прымуць удзел каманды, вылучаныя нізавымі вытворчымі калектывамі. У састаў каманды ўвойдуць дзве жанчыны і пяць мужчын.

У эстафеце будзе ўдзельнічаць каля 150 чалавек.



Група студэнтаў Беластоцкага педагагічнага інстытута. Фота А. Сапіра.

Беластоцкая дзяржаўная філармонія ў новым сезоне

Згодна распараджэння Галоўнага Упраўлення музыкальных устаноў Камітэта па справах мастацтваў пры Соўнаркоме СССР, калектывы і салісты Беластоцкай абласной філармоніі ў прадстаячым сезоне будуць абслугоўваць усе заходнія вобласці Беларускай рэспублікі. У сувязі з гэтым у бліжэйшы час адкрыецца аддзяленне філармоніі ў Баранавічах.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам дырэктар філармоніі тав. Вайнберг заявіў:

— У дзень адкрыцця новага сезона 1 лістапада будзе дан вялікі канцэрт з удзелам спецыяльна запрошанага маскоўскага дырыжора Н. Аносава. У канцэрце прыме ўдзел лаурэат Усесаюзнага конкурса піяністаў, Ісак Міхноўскі. Праграма канцэрта прысвечана творчасці Чайкоўскага. Будуць выкананы патэтычная сімфонія, канцэрт для фартэпіяна № 1 і сюіта № 3.

На працягу сезона філармонія дасць у Беластоку 35 канцэртаў, з іх 7 канцэртаў — манаграфій, 10— тэматычных і 18 — змешаных. Штомесячна адбудзецца 5 сімфанічных канцэртаў. У выхадныя дні будуць даны ранішнікі для вучняў з спецыяльна падабранай праграмай. Акрамя таго план работы філармоніі прадугледжвае 11 лекцый-канцэртаў. цыкл спецыяльна тэматычных канцэртаў (песні народаў СССР, песні Чырвонай Арміі, песні совецкага кіно) і літаратурныя вечары, прысвечаныя творчасці Пушкіна, Горкага, Талстога, Лермантава, Маякоўскага і іншых пісьменнікаў.

Адбудзецца таксама рад канцэртаў, прысвечаных яўрэйскай літаратуры і песні з удзелам яўрэйскіх пісьменнікаў, паэтаў і артыстаў.

Галоўным дырыжорам філармоніі запрошан А. І. Дэмбо. За час сезона ў Беласток прыбудуць на гастрольныя выступленні рад выдатных артыстаў нашай краіны, сярод іх дырыжоры Гаук, прафесар Столяраў, заслужаны артыст РСФСР Коган, Столаў, Шчэглоў, лепшы чытальнік Совецкага Саюза В. Яхантаў, спявачка Ірма Яунзен і іншыя.

З мясцовых сіл у якасці салістаў выступяць піяніст Калецкі, скрыпач Бернштэйн і віяланчэліст Бакман.

Вялікае месца ў рабоце філармоніі займае падрыхтоўка да дэкады совецкай музыкі. У Беластоку гэта дэкада будзе праведзена з 5 па 15 снежня.

У плане работы філармоніі прадугледжана таксама абслугоўванне вясковага насельніцтва. Намечана правядзенне ў радзе раёнаў фестываля музыкі для калгаснікаў. У фестывалі прымуць удзел сімфанічны аркестр філармоніі, ансамбль беларускай песні і пляскі пад кіраўніцтвам тав. Шырмы і салісты ленінградскай філармоніі, якія неўзабаве прыязджаюць сюды на гастролі. Зараз спецыяльная камісія распрацоўвае праграму фестываля.

Тав. Вайнберг падкрэсліў, што нармальнай рабоце філармоніі значна перашкаджае адсутнасць уласнага канцэртнага зала.

Наспеўшае пытанне

У сувязі з апублікаваннем у газеце «Праўда» артыкула аб неабходнасці для нашых партыйных і совецкіх кадраў ведаць мову сваёй рэспублікі, я хачу зрабіць некаторыя заўвагі аб становішчы з беларускай мовай у Беластоку.

Узяць хоць-бы такі факт. У большасці беларускіх надпісаў на шыльдах устаноў ці прадпрыемстваў ёсць грубыя арфаграфічныя памылкі. Я прывяду толькі выпадкова мною заўважаныя: «Городскі Совет Асоавіяхіма», «Гарадзкі Выканаўчы Камітэт», НКСўвязі, «Гарадзкая Тэлефонная станція», «Заходня-Беларускі трэст будматэрыялаў», «Выдача пісем да вастребования» і т. д.

Няўважлівасць да такіх «дробязей», як правапіс, сведчыць аб нізкім узроўні ведаў па беларускай мове многіх кіруючых работнікаў нашых устаноў і прадпрыемстваў.

Артыкул у «Праўде»—вельмі своечасовы і павінен паслужыць штуршком да вывучэння мовы сваёй рэспублікі многімі кіруючымі таварышамі.

Г. Златагораў.

КУДЫ ПАЙСЦІ?

(Пісьмо ў рэдакцыю)

Дамбрава — раённы цэнтр, але ў ім няма ні клуба, ні дома соцыялістычнай культуры. Кінокарціны дэманстрыраваліся ўсяго толькі 3—4 разы.

Заканчэнне будаўніцтва дома соцыялістычнай культуры кіраўніцтвам раёна з часу на час адкладваецца. Узнікае пытанне: калі, нарэшце, будуць створаны ўмовы для культурнага правядзення вольнага часу?

Р. К.

Нам. адказнага рэдактара
Г. М. КУЗНЯЦОЎ.

ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА № 31

ПАСЯДЖЭННЯ БЕЛАСТОЦКАГА ГАРАДСКОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА ад 15 кастрычніка 1940 года.

АБ АБАВЯЗКОВАЙ РЭГІСТРАЦЫІ РАДЫЁПРЫЁМНІКАЎ.

Горвыканком адзначае, што пастанова Соўнаркома СССР ад 29-га верасня 1939 года аб рэгістрацыі радыёпрыёмнікаў па гораду **не выконваецца.**

Большасць радыёпрыёмнікаў, якія маюцца ў арганізацыях і ў індывідуальным карыстанні, не зарэгістрыраваны.

Горвыканком пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім арганізацыям і індывідуальным уладальнікам: незарэгістрыраваныя радыёпрыёмнікі неадкладна зарэгістрыраваць у бліжэйшым паштовым аддзяленні.

2. Прапанаваць радыёкамітэту арганізаваць сетку кантралёраў для выяўлення незарэгістрыраваных радыёпрыёмнікаў і да ўхіліўшыхся ад рэгістрацыі прымяняць санкцыі, прадугледжаныя пастановай Соўнаркома СССР ад 29 верасня 1939 года.

Старшыня Беластоцкага горвыканкома
І. РАЖНОЎСКІ.

Сакратар Беластоцкага горвыканкома
Ф. ОКУНЬ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—82. Тыраж—10.000 экз. Друкарня Беластокдрук.